УДК 2; 908

# КАНФЕСІЙНАЯ ПАЛІТРА ВІЦЕБСКА Ў XIX СТ.

***Уткевіч В.І., к.філал.н., дац., Кацук А.В., студ.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *Артыкул прысвечаны аналізу канфесійнай разнастайнасці Віцебска ў XIX ст. Разгледжаны прычыны гэтай з'явы і яе ўплыў на знешні воблік горада і яго грамадска-палітычнае жыццё.*

Ключевые слова: Віцебск, канфесіі, праваслаўе, каталіцтва, уніяцтва, іудаізм, стараверства.

Віцебск з'яўляецца горадам, у якім на працягу доўгіх стагоддзяў мірна суіснуюць прадстаўнікі розных рэлігій. Традыцыйнымі для яго можна назваць наступныя канфесіі: праваслаўная, каталіцкая, стараверская, уніяцкая, іудаізм. Адзначым, што на дадзены момант у горадзе зарэгістравана больш за 80 рэлігійных абшчын, якія адносяцца да 16 розных канфесій. Больш за палова з іх адносіцца да Беларускага Экзархату Рускай Праваслаўнай Царквы, ва ўласнасці якой маецца большасць культавых будынкаў – гістарычных помнікаў, адноўленых нядаўна і новапабудаваных. Аднак дадзенае становішча існавала не заўсёды. Справа ў тым, што чыста колькасныя суадносіны паміж прадстаўнікамі названых кафесій увесь час перажывалі змены ў працэсе гістарычнага развіцця Віцебска. Шмат у чым гэты феномен быў дэтэрмінаваны зменамі ў адміністрацыйным яго становішчы. З моманту ўваходжання беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі, Віцебск спачатку ўваходзіў у склад Пскоўскай (1772–1776) і Полацкай (1776–1796) губерній, а затым, пасля ўтварэнния Беларускай губерніі, Віцебск становіцца губернскім горадам у ёй. У такой якасці ён праіснаваў у перыяд з 1796 па 1802 гады. Наступная змена адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення адбылася напачатку XIX ст. Указам Сената ад 27 лютага 1802 г., зацверджаным імператарам Аляксандрам I, замест Беларускай губерніі засноўваліся Віцебская і Магілёўская. Такім чынам, самастойная Віцебская губернія праіснавала непасрэдна да Кастрычніцкага перавароту 1917 г.

Другім фактарам змены колькасных суадносін прадстаўнікоў розных канфесій з'явілася ўваходжанне самастойнай уніяцкай царквы ў склад Рускай Праваслаўнай царквы. Як вядома, 5 лістапада 1827 г. біскупам Іосіфам Сямашкам, а пазней архібіскупам Віленскім, была складзена знакамітая запіска аб справах ва ўніяцкай царкве, аб яе моцным лацінскім ухіле. Пасля паўстанняў 1831–1832 гг. Расійскія ўлады прынялі план-праект па ўз'яднанні уніятаў з праваслаўнай царквой. Разгледзім, якім чынам гэтыя працэсы адбіліся на жыцці Віцебскай епархіі. У красавіку 1833 г. была створана Полацкая і Віленская епархія, куды ўвайшлі і землі Віцебшчыны, а ў верасні 1839 года яе кафедра зноў пераехала ў Віцебск. Суседнія Магілёўская, Пскоўская і Смаленская епархіі дапамаглі тым, што прыслалі сваіх дыяканаў і пеўчых для царкоўных кліpacaў. Акрамя таго, ва ўніяцкіх школах ўвялі абавязковым прадметам рускую мову, забаранілі ўжываць каталіцкае адзенне і арган падчас набажэнства. Гэты і іншыя крокі прывялі да таго, што на Полацкім Саборы грэка-уніяцкіх біскупаў 1839 года было прынятае гістарычнае рашэнне аб яднанні унятаў з Праваслаўнай Царквой. Урачастыя падзеі, прысвечаныя гэтай гістарычнай падўзеі 1839 года дастаткова падрабязна апісаныя. Сявточныя набажэнствы ў сувязі з ёй прайшлі як у Полацку, так і ў Віцебску. «Узначаліў урачыстасці ў Віцебску мітрапаліт Кіеўскі Філарэт (Амфітэатраў). 14 мая 1839 г., на свята прасвятой троіцы, у Свята-Успенскім кафедральным саборы ім была здзейснена урачыстая Боская літургія ў саслужэнні біскупаў Полацкага Ісідара (Нікольскага) і Аршанскага Васілія (Лужынскага) і васьмярых святароў пры вялікай колькасці народа» [1, с.107].

Натуральна, што ў сувязі з далучэннем уніятаў да праваслаўя адбыліся і дастаткова радыкальныя змены ў галіне духоўнай адукацыі. Заснаваная ў 1807 г. Віцебская духоўная семінарыя спачатку працавала як уніяцкая, а вось якраз з 1839 г. яна пачала дзейнічаць як праваслаўная. Прычым, першапачаткова семінарыя знаходзілася ў Полацку, а в 1856 г. была пераведзена ў Віцебск, аднак да 1871 г. захоўвала сваю старую назву Полацкай. Асноўнай яе задачай з'яўлялася падрыхтоўка парафіяльных святароў для Полацкай дыяцэзіі. Вучыліся тут і прадстаўнікі свецкіх саслоўяў. Сярод выпускнікоў быў адзін з

ідэолагаў тэорыі «заходнерусізму» К. А. Гаварскі. Акрамя семінарыі, у 1810 г. пачынае працаваць мужчынскае духоўнае вучылішча, а ў 1864 г. адкрываецца Віцебскае жаночае духоўнае вучылішча.

На Віцебшчыне пасялілася дастаткова шмат стараабраднікаў, якія перабраліся на яе тэрыторыю, пасля таго як у рускай Праваслаўнай Царкве адбыўся раскол, звязаны з рэфомамі патрыярха Нікана. Вялікі ўнёсак у справу захавання і памнажэння духоўнай і культурнай спадчыны стараабраднікаў-беспапоўцаў унёс віцебскі купец Іван Іванавіч Сабальшчыкоў (1763–1836). Ён актыўна збіраў рукапісныя і друкаваныя кнігі, старажытныя іконы. Ён сам асабіста перапісаў шмат багаслоўскіх кніг і некалькі Евангелляў. Нягледзячы на тое, што І. І. Сабальшчыкоў быў вельмі багатым чалавекам (меў у Віцебску тры цагляныя дамы, у адным з якіх знаходзілася малельня), ён вызначаўся вялікай сціпласцю. Для таго, каб стымуляваць пераход стараабраднікаў у дзяржаўную царкву, у 1887 годзе было створана Віцебскае епархіяльнае брацтва ў імя святога роўнаапостальнага вялікага князя Уладзіміра. Яно займалася галоўным чынам місіянерскай працай именно сярод стараабраднікаў, але арганізоўвала і публічныя лекцыі, на якія запрашаліся ўсе жадаючыя. У 1893 годзе ў Архіерэйскім доме на сродкі брацтва было адкрыта Віцебскае царкоўна-археалагічнае старажытнасховішча. 25 кастрычніка 1895 года пры брацтве была заснавана камісія па кіраванні царкоўна-археалагічным музеем, які знаходзіўся ў рэзідэнцыі полацкага арцыбіскупа ў Віцебску (т.зв. архіерэйскі дом). Актыўны ўдзел у яго працы прымалі такія вядомыя навукоўцы як А. П. Сапуноў і Я. Р. Раманаў. Яны з розных этнаграфічных экспедыцый і агляду храмаў прывезлі шэраг старажытных манускрыптаў і старадрукаваных кніг, партрэты епіскапаў, спісы з шануемых ікон. Дзякуючы іх дзейнасці адразу пачаў складацца «Летапіс музея». Асабліва падкрэлім наяўнасць у музеі медаля на ўз'яднанне уніятаў з праваслаўнай царквой са знакамітым надпісам «Адрынутыя гвалтам 1596 уз'яднаны любоўю 1839».

Гаворачы аб канфесійнай палітры Віцебшчыны ў агульным, неабходна адзначыць, што ў 1897 годзе яна мела наступныя колькасныя складнікі: 54,4 % праваслаўныях, 24 % – каталікоў, 11,8 % іудзеяў [2, с. 13]. Прыведзеныя дадзеныя патрабуюць пэўнага тлумачэння, бо аповед вядзецца не толькі пра сам горад, але пра ўсю Віцебскую губерню цалкам. Адносна ж колькасці іудзеяў непасрэдна ў губернскім цэнтры, – яна была нашмат большай. Гэты феномен быў характэрны для ўсіх беларускіх тагачасных гарадоў. Справа ў тым, што гэтыя тэрыторыі ў часы імператарскай Расіі ўваходзілі ў склад так званай "рысы аселасці", сяліцца за межамі якой многім іудзеям было забаронена. Забаронена ім таксама было жыць у сельскай мясцовасці. У сувязі з такім становішчам спраў, іудеі масава сяліліся ў гарадах і ў так званых мястэчках, дзе яны пачалі нават колькасна пераважаць у XIX ст. Так напрыклад, А. П. Сапуноў у сваёй працы «Некалькі слоў пра яўрэйскае насельніцтва горада Віцебска» прыводзіць дадзеныя аб тым, што за сто гадоў XIX стагоддзя колькасць усіх хрысціянскіх храмаў у гэтым горадзе (праваслаўных, каталіцкіх, уніяцкіх, пратэстанцкіх) павялічылася на вельмі маленькую велічыню (з 27 да 30), а колькасць іудэйскіх малітоўных дамоў узрасла шматкроць – з 4 да 60, прычым абсалютная большасць з іх належала хасідам. Такім чынам, Віцебск стаў найважнейшай апорай менавіта артадаксальнага іудаізму. Дарэчы, яшчэ пачынаючы з канца XVIII стагоддзя, горад ужо з'яўляўся адным з асноўных цэнтраў такога напрамку ўнутры хасідызму, як Хабад. Пачынаючы ж з XIX стагоддзя, у сувязі з масавым прыбыццём у Віцебск яўрэяў, якія былі выселены з Масквы, адбылося істотнае павелічэнне ўплыву элементаў Баскалы. Пачаў развівацца такі палітычны рух, як Хавэвэй Цыён, а пазней і сацыялістычны рух Бунд. Віцебск быў адным з самых першых цэнтраў Бунда, а сіяністкі лідэр Г. Брук з'яўляўся казённым рабінам горада, пачынаючы з 1901 года. Прыведзеныя дадзеныя аб шматразовым павелічэнні ў Віцебску колькасці сінагог, з'яўляецца следствам павелічэння колькасці саміх іудзеяў у горадзе. Так, напрыклад, да 1897 года іх стала 52,4 % ад агульнай колькасці насельніцтва. Неабходна разумець, што гаворка ідзе менавіта аб іудзеях, а не аб этнічных яўрэях, бо ў Расіі ўлік вёўся толькі па рэлігійнай, а не па нацыянальнай прыкмеце. Адпаведна этнічных яўрэяў было больш, у сувязі з тым, што многія з іх былі ахрышчаны ў хрысціянскую веру. Вядома, прыведзеная намі канфесійная структура дае падставу убачыць у тагачасным Віцебску дзве выявы. З аднаго боку (de jure), ён належыў Расійскай імперыі, але з другога (de facto), вядучая роля ў сацыяльным і культурным жыцці мела яўрэйская абшчына хасідаў. Такім чынам, водападзел паміж імперскім і яўрэйскім горадам праходзіў у першую чаргу не па тэрытарыяльнай прыкмеце, а ў сферы мовы, веры, звычаяў і, як цяпер прынята казаць, у менталітэце яго жыхароў. Па сутнасці, гэта былі два дастаткова адасобленыя светы і лады жыцця.

Як ужо было заўважана вышэй, другое месца па колькасці ў Віцебскай губерні займалі прадстаўнікі каталіцкай канфесіі. Жылі яны ў асноўным у заходніх раёнах губерніі. Прычым, іх адцоткавы колькасны склад амаль не змяніўся і на гэты час. Вядома, гістарычна паміж праваслаўнымі і каталікамі існавалі пэўныя спрэчкі. Можна лічыць, што гісторыя ўзаемаадносін паміж імі дастаткова складаная і дыялектычна супярэчлівая. Справа ў тым, што беларускія землі здаўна служылі ў якасці спецыфічнага геапалітычнага моста паміж усходняй і заходняй цывілізацыямі. Прысутнасць жа каталікоў у горадзе была бачная, бо рэзідэнцыя і калегіум іезуітаў знаходзіліся ў Ніжнім замку, на месцы сучаснай плошчы Свабоды і прылеглай да яе тэрыторыі. Бернардынскі касцёл святога Антонія ўваходзіў у архітэктурны ансамбль Рынкавай плошчы Віцебска ў XIX ст.

На заканчэнне адзначым, што калі колькасныя суадносіны паміж праваслаўнымі і каталікамі змяніліся да цяперашняга моманту ў вельмі малой ступені, то астатняя рэлігійная палітра зведала дастаткова сур'ёзныя змены. Па-першае, рэзка зменшылася не толькі колькасць іудзеяў, але таксама і этнічных яўрэяў. Звязана гэта з многімі прычынамі: эміграцыя, масавае знішчэнне яўрэяў нацысцкімі акупантамі, пераход у праваслаўе і каталіцызм. Па-другое, паменшылася і колькасць уніятаў: частка з іх сталі праваслаўнымі, а частка – каталікамі. Па-трэцяе, рэзка зменшылася колькасць стараверaў, якія ў асноўным перайшлі пад заступніцтва Рускай Праваслаўнай Царквы. Аднак, нягледзячы на ўсе змены, што адбыліся, можна канстатаваць, што на Віцебшчыне і зараз існуе міжканфесійнае суладдзе.


Спіс выкарыстаных крыніц

1. Архиепископ Димитрий (Дроздов). Витебская епархия: история и современность: монография / Димитрий Дроздов, арх. – Минск: Медиасонт, 2011. – 232 с.


УДК 82

# ЖАНР РОМАНИЗИРОВАННОЙ БИОГРАФИИ В ИСТОРИИ ЛИТЕРАТУРЫ


***Уткевич О.И.[1], к.филол.н., доц., Мизина М.В.[2], студ.***

*[1] Витебский государственный технологический университет,*
*г. Витебск, Республика Беларусь*

*[2] Российский государственный гуманитарный университет,*
*г. Москва, Российская Федерация*



Реферат. *В статье анализируется становление жанра романизированной биографии в отечественной и зарубежной литературе от эпохи античности до XX в. Утверждается, что с течением времени возрастает интерес к беллетризованному изложению событий жизни знаменитых людей, представителей культуры, политики, науки, писателей и музыкантов.*



Ключевые слова: романизированная биография, история литературы, культура, личность, характер.


Романизированная биография представляет собой пограничный документально-художественный жанр. Истоки термина восходят к определению классика французской литературы и блестящего мастера литературной биографии («biografie romance») XX века – А. Моруа. Созданные им биографии французских романтиков – «Три Дюма», «Олимпио, или жизнь Виктора Гюго», «Леллия, или Жорж Санд», «Байрон», «Тургенев» стимулировали научный интерес к жанру. «Жанр этот существует, хотя и не имеет собственной поэтики и истории» [2, с. 430], – констатировал в 1982 г. К. Андреев, один из отечественных исследователей творчества самого А. Моруа. Позже в отечественном литературоведении ситуация несколько изменилась, и теория жанра обогатилась исследованиями Б. Зайцева, Н. Берберовой, Ю. Тынянова, которые были как создателями романов-биографий, так и теоретиками формирующегося жанра.

Уже в самом начале XX века Г. Винокур в книге «Биография и культура» отмечал культурологический пафос биографических книг, несмотря на их документальность и эмпирику. Ведь понятие «личная жизнь» не тождественно понятию «личность». Личная